БЕЛАРУСКАЯ ФЕДЭРАЦЫЯ АРЫЕНТАВАННЯ
BELARUS ORIENTEERING FEDERATION




# VERAS 2021

# ВЕРАС 2021

GRODNO | 25-26 SEPTEMBER

ГРОДНА | 25-26 ВЕРАСНЯ

# БЮЛЕТЭНЬ №2




ORIENTEERING CLUB
VERAS

**БЮЛЕТЭНЬ №2**

**АДКРЫТЫЯ СПАБОРНІЦТВЫ**

**ПА СПАРТЫЎНАМУ АРЫЕНТАВАННЮ**

**«ВЕРАС 2021»**

**Этапы Кубка БФА сярод эліты і юнакоў**
**Першынство Гродзенскай вобласці па спартыўнаму арыентаванню**
**Чэмпіянат Гродзенскай вобласці на доўгай дыстанцыі**

***Прысвячаюцца 40-годдзю з моманту правядзення першага “Кубка Гродна” па арыентаванню***

## АРГАНІЗАТАРЫ

КСА "Верас", ГСА “Беларуская федэрацыя арыентавання”

- Галоўны суддзя – Баўшэвіч Ганна +375 29 867 60 88
- Галоўны сакратар – Красько Наталля +375 29 784 54 76
- Кантралёр БФА – Міхалкін Дзмітрый
- Інспектар – Крапіўка Дзмітрый

## МЭТЫ І ЗАДАЧЫ

Спаборніцтвы праводзяцца з мэтай развіцця і папулярызацыі спартыўнага арыентавання ў Рэспубліцы Беларусь і асабліва Гродзенскай вобласці.
Асноўнымі задачамі стартаў з’яўляюцца:

- паляпшэнне спартыўнага майстэрства ўдзельнікаў;
- прывабліванне вучняў да сістэматычных заняткаў фізічнай культурай і спортам;
- вызначэнне наймацнейшых спартоўцаў.

## ДАТА І МЕСЦА

24-26 верасня 2021 года, Беларусь, г. Гродна і Гродзенскі раён.

## ПРАГРАМА

**24.09.2021 (пятніца)**

- Прыбыццё каманд

**25.09.2021 (субота)**

- 10:00-12:00 – рэгістрацыя ў цэнтры спаборніцтваў.
- 12:15 – адкрыццё.
- 13:00 – пачатак старту на доўгай дыстанцыі (юнацкі рэйтынг).
- 19:00-20:30 – старт арыент-шоў Білдынг-О (арыентаванне ўнутры гандлёва-забаўляльнага комплексу)

**26.09.2021 (нядзеля)**

- 10:00-11:00 – рэгістрацыя ў цэнтры спаборніцтваў.
- 11:00 – пачатак старту на сярэдняй дыстанцыі (юнацкі і элітны рэйтынгі).
- 11:30-12.30 – старт груп МЖ8
- 14:00-15:00 – узнагароджванне пераможцаў і прызёраў, а таксама ўсіх удзельнікаў груп МЖ8. Закрыццё спаборніцтваў.

## УДЗЕЛЬНІКІ І ГРУПЫ

Да удзелу запрашаюцца зборныя абласцей, раёнаў, гарадоў, каманды клубаў, а таксама спартоўцы, якія выступаюць асобна. Склад каманд не абмежаваны.
Спаборніцтвы адбудуцца па наступных групах:
МЖ65, МЖ55, МЖ45, МЖ35, МЖ21Е, МЖ21А, МЖ18, МЖ16, МЖ14, МЖ12, МЖ10, МЖ8
Дыстанцыя МЖ8 будзе арганізавана толькі ў другі дзень 26.09.2021 і на Білдынг-О, з магчымасцю суправаджэння бацькамі і ўзнагароджваннем усіх удзельнікаў.

## АДЗНАКА

На спаборніцтвах будзе выкарыстоўвацца сістэма адзнакі SPORTident. Дапускаецца выкарыстанне асабістых SI-чыпаў любой серыі. Будзе мажліва выкарыстанне бескантактнай сістэмы SPORTident AIR+.

Кошт арэнды чыпаў у арганізатараў:
МЖ 10-18 – 1 BYN/дзень
МЖ 21-65 – 2 BYN/дзень
AIR – 4 BYN/дзень
У груп МЖ8 адзнака будзе ажыццяўляцца кампосцерам у месцы з адпаведным малюнкам, надрукаваным на мапе.

# ТЭХНІЧНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ

**25.09.2021 (субота) – мапа «Вярхполле», доўгая дыстанцыя.**




***Мапа і мясцовасць:*** праходнасць ад добрай да сярэдняй. Перапады на схілах да 20 метраў. Сетка шляхоў развіта добра. Маштаб 1:10 000, сячэнне 2,5 м.
Аўтар мапы: Сяргей Верабей, 2020-2021 гг.
Планіроўшчык: Сяргей Верабей
Частка мапы выкарыстоўвалася на спаборніцтвах "Гродзенская лясная шматдзёнка 2021"
Каардынаты месцазнаходжання: 53.793296, 23.962273

***Папярэднія параметры доўгая дыстанцыі.***

| Група | Даўжыня дыстанцыі | Колькасць КП |
|---|---|---|
| M21E | 15 | 30 |
| Ж21Е М35 | 10 | 22 |
| M18 M21A | 7,5 | 20 |
| Ж35 M45 | 7 | 18 |
| Ж45 M55 | 6 | 15 |
| M16 Ж18 Ж21A | 5,3 | 15 |
| Ж55 M65 | 5 | 14 |
| Ж65 | 3,5 | 13 |
| Ж16 | 4 | 13 |
| M14 | 3,5 | 10 |
| Ж14 | 3 | 9 |
| M12 | 2,2 | 8 |
| Ж12 | 2,2 | 7 |
| МЖ10 | 1,8 | 6 |

**25.09.2021 (субота) – Арыент-шоў Білдынг-О.**

Арыент-шоў пройдзе ўнутры гандлёва-забаўляльнага комплексу OldCity https://oldcity.by/. Старт па падыходу ўдзельнікаў. Будзе выкарыстоўвацца электронная адзнака, таму трэба з сабой мець чып.
**Увага! Калі Вы вырашыце прыйсці напрыканцы стартавага часу, Вам спатрэбіцца ліхтарык.**
Каардынаты месцазнаходжання: 53.701758, 23.834164
Кіраўнік дыстанцыі: Дзмітрый Крапіўка +375 29 566 44 79

**26.09.2021 (нядзеля) – мапа «Румлёва», сярэдняя дыстанцыя.**





***Мапа і мясцовасць:*** гарадская забудова 30%, парк і лесапарк. Моцнаперасечаная мясцовасць пераважна добрай праходнасці, з досыць развітой сеткай шляхоў ды сцежак. Маштаб: 1:7500, 1:10000, сячэнне 5 м.
Аўтар мапы: Верабей Сяргей, Баўшэвіч Ганна, 2021г.
Планіроўшчыца: Баўшэвіч Ганна
Каардынаты месцазнаходжання: 53.651219, 23.860503

***Папярэднія параметры сярэдняй дыстанцыі.***

| Група | Даўжыня дыстанцыі | Колькасць КП |
|---|---|---|
| М21Е | 5,5 | 26 |
| М18 Ж21Е М35 | 4,7 | 22 |
| Ж35 М45 | 4,0 | 18 |
| Ж45 М55 | 3,8 | 17 |
| М16 Ж18 М21А | 3,7 | 15 |
| Ж55 М65 | 3,6 | 15 |
| Ж65 | 2,9 | 14 |
| Ж16 Ж21А | 2,9 | 13 |
| М14 | 2,3 | 10 |
| Ж14 | 1,9 | 8 |
| М12 | 1,8 | 8 |
| Ж12 | 1,6 | 7 |
| МЖ10 | 1,0 | 5 |
| МЖ8 | 0,5 | 4 |

На дыстанцыі МЖ8 абавязкова суправаджэнне старэйшага!

## ЗАЧЫНЕНЫЯ РАЁНЫ ДЛЯ ТРЭНАВАННЯЎ




[Раёны правядзення спаборніцтваў “Верас 2021” (Google Мае мапы)]

## ЗАЯЎКА

- Заяўкі прымаюцца па 21 верасня 2021 на сайце ГСА «БФА» orient.by
- Для таго каб падаць заяўку, неабходна зарэгістравацца і аўтарызавацца ў сістэме. Адзін зарэгістраваны карыстальнік можа падаць заяўку ад некалькіх удзельнікаў спаборніцтваў.
- Аплата мэтавага ўзносу адбываецца альбо пры рэгістрацыі наяўным, альбо праз сістэму АРІП, альбо на разліковы рахунак БФА (інструкцыя па аплаце на сайце ГСА «БФА»: http://orient.by/erip/). У выпадку безнаяўнай аплаты неабходна мець з сабой раздрукаваную квітанцыю (ці даслаць яе на вайбер сакратару).
- Штраф за недаезд удзельніка - 50% стартавага ўзносу.
- Мэтавы ўзнос у групах:

| ГРУПА | 1 дзень | 2 дні | Білдынг-О |
|---|---|---|---|
| МЖ 8 | бясплатна | бясплатна | бясплатна |
| МЖ 10-14 | 6 BYN | 12 BYN | 2 BYN |
| МЖ 16-18 | 8 BYN | 16 BYN | 5 BYN |
| МЖ 21(юниоры до 20 лет) и МЖ 65 | 10 BYN | 20 BYN | 5 BYN |
| МЖ 21-55 | 15 BYN | 30 BYN | 7 BYN |
| Арэнда чыпа МЖ 10-18 | 1 BYN | 2 BYN | - |
| Арэнда чыпа МЖ 21-65 | 2 BYN | 4 BYN | - |
| Арэнда эйр чыпа | 4 BYN | 8 BYN | - |

*Арэнда чыпа для спартоўцаў Гродзенскай вобласці - бясплатна. Індывідуальныя зніжкі, пры неабходнасці, можна абмеркаваць з галоўным суддзёй спаборніцтваў.

## ФІНАНСАВАННЕ

Выдаткі, звязаныя з арганізацыяй і правядзеннем спаборніцтваў, нясуць арганізатары. Выдаткі на ўдзел спартоўцаў у спаборніцтвах (праезд, харчаванне, пражыванне) нясуць арганізацыі, якія камандзіруюць спартоўцаў, альбо самі спартоўцы.

Для забеспячэння правядзення спаборніцтваў удзельнікі альбо каміндзіруючыя арганізацыі аплачваюць мэтавы ўзнос на арганізацыю спаборніцтваў.

## ПРАЖЫВАННЕ

За арганізацыю пражывання ў гасцініцах і хостэлах г. Гродна ўдзельнікі адказваюць самастойна. Таксама арганізатарамі будзе прапанаваны варыянт пражывання ў адной са школ горада, якая знаходзіцца каля месца старта Білдынг-О.

## ТРАНСПАРТ

Спартоўцы выкарыстоўваюць асабісты транспарт. Пры неабходнасці будзе арганізаваны праезд удзельнікаў з Гродна на арэну спаборніцтваў першага дня - 25.09.21г. Прыкладны кошт праезду 5-7 BYN у залежнасці ад кольскасці заявак. Адпраўленне транспарту ажыццяўляецца ад чыгуначнага вакзалу каля 11:00.
!!!НА ТРАНСПАРТ НЕАБХОДНА ПАПЯРЭДНЯЯ ЗАЯЎКА!!!

## УМОВЫ ВЫЗНАЧЭННЯ ВЫНІКАЎ І ПАРАДАК ЎЗНАГАРОДЖВАННЯ

Па выніках усіх дысцыплін спаборніцтваў вядзецца асабісты залік. Асабісты вынік у спаборніцтвах вызначаецца па занятаму месцу асобна ў кожным старце ў кожнай узроставай групе сярод юнакоў і дзяўчын, мужчын і жанчын.

Пераможцы і прызёры ўзнагароджваюцца ганаровымі граматамі і медалямі, а таксама каштоўнымі прызамі па выніках кожнай дыстанцыі: доўгай, арыент-шоў, сярэдняй.

## КАНТАКТЫ

E-Mail: veras.orient@gmail.com

ВК: vk.com/orient_v_grodno

Інстаграм: @grodno.orient

Тэлефон галоўнага суддзі – 375 29 867 60 88 (Баўшэвіч Ганна)

Тэлефон галоўнага сакратара – 375 29 784 54 76 (Красько Наталля)

## ПАРТНЁРЫ

ГРАФСКАЯ
ПИТЬЕВАЯ ВОДА

NADZEJKA

DREAM MAKERS
group of companies




FANCY

GARMIN®

MYSPORT
СПОРТИВНЫЙ МАГАЗИН

SEVEN STARS
siding | windows | doors | gutters
remodeling

E-SUD.BY

BS | Белявский
экономические споры

# ГІСТОРЫЯ “КУБКА ГРОДНА” ў фотакартках

З успамінаў Леаніда Маланкова: “...з 1979 г. праводзілі матчавую сустрэчу паміж прадпрыемствамі "Сінтвалакно" Гродна і Даўгаўпілса. Акрамя нас у гэтых сустрэчах прымалі ўдзел спартоўцы іншых прадпрыемстваў горада. Вырашылі зрабіць спаборніцтвы больш адкрытымі. Далучылі спорткамітэт г. Гродна. Напісалі рэгламент адкрытага Кубка Гродна. І ў кастрычніку 1981 г. адбыўся першы КУБАК ГРОДНА“.

Галоўны суддзя – Валерый Бойка.

Мапы першага Кубка Гродна:

- першы дзень "Мелавыя горы" - Сяргей Гаявы,
- другі - "Плябанішкі" - Леанід Маланкоў,
- трэці - "Зарыца" - Леанід Маланкоў.

На фота ў цэнтры – Леанід Маланкоў – ідэйны натхняльнік правядзення першага Кубка Гродна па спартыўнаму арыентаванню, а таксама аўтар шмат якіх гродзенскіх мап таго часу; злева – Сяргей Верабей – складальнік сучасных мап для спартыўнага арыентавання, у той час – спартовец-актывіст і арганізатар; справа – Ігар Чэрэвач.



На наступным фотаздымку ў цэнтры таксама аўтар шмат якіх гродзенскіх мап і актывіст таго часу Сяргей Гаявы. Злева - Таіса Маланкова, справа – Святлана Данілава.



Медалі першага "Кубка Гродна"




